ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

⊙ № 33 (790) ⊙ Чацвер, 19 лістапада 1970 г. ⊙ Цана 2 кап. ⊙ Год выдання XXIV

## АБ СКЛІКАННІ ЧАРГОВАГА XXVII З'ЕЗДА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

*Пастанова Пленума ЦК КП Беларусі*

**1. СКЛІКАЦЬ ЧАРГОВЫ XXVII З'ЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ 18 ЛЮТАГА 1971 ГОДА.**

**2. ЗАЦВЕРДЗІЦЬ НАСТУПНЫ ПАРАДАК ДНЯ З'ЕЗДА:**

**1) СПРАВАЗДАЧНЫ ДАКЛАД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП БЕЛАРУСІ — ДАКЛАДЧЫК ПЕРШЫ САКРАТАР ЦК КПБ ТАВ. МАШЭРАЎ П. М.**

**2) СПРАВАЗДАЧНЫ ДАКЛАД РЭВІЗІЙНАЙ КАМІСІІ КП БЕЛАРУСІ — ДАКЛАДЧЫК СТАРШЫНЯ РЭВІЗІЙНАЙ КАМІСІІ ТАВ. КАНАНОВІЧ І. С.**

**3) ВЫБАРЫ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП БЕЛАРУСІ.**

**4) ВЫБАРЫ РЭВІЗІЙНАЙ КАМІСІІ КП БЕЛАРУСІ.**

**3. УСТАНАВІЦЬ НАСТУПНЫЯ НОРМЫ ПРАДСТАЎНІЦТВА НА XXVII З'ЕЗД КП БЕЛАРУСІ: АДЗІН ДЭЛЕГАТ З РАШАЮЧЫМ ГОЛАСАМ АД 600 ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ І АДЗІН ДЭЛЕГАТ З ДАРАДЧЫМ ГОЛАСАМ АД 600 КАНДЫДАТАЎ У ЧЛЕНЫ ПАРТЫІ.**

**4. ДЭЛЕГАТЫ НА XXVII З'ЕЗД КП БЕЛАРУСІ ВЫБІРАЮЦЦА ЗГОДНА СА СТАТУТАМ ПАРТЫІ ЗАКРЫТЫМ (ТАЙНЫМ) ГАЛАСАВАННЕМ НА АБЛАСНЫХ ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ.**

**КАМУНІСТЫ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ САВЕЦКАЙ АРМІІ, УНУТРАНЫХ І ПАГРАНІЧНЫХ ВОЙСК, ВЫБІРАЮЦЬ ДЭЛЕГАТАЎ НА XXVII З'ЕЗД КП БЕЛАРУСІ РАЗАМ З АДПАВЕДНЫМІ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫМІ ПАРТЫЙНЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ НА АБЛАСНЫХ ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ.**



*НА ЗДЫМКУ: у кабінеце марксісцка-ленінскай філасофіі. Сюды часта прыходзяць займацца студэнты 5-га курса аддзялення філасофіі Тадэуш Адула і Міхаіл Віннікаў.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

Насустрач XXIV з'езду

## ПРЫЗНАНА МЭТАЗГОДНЫМ

На чарговым пасяджэнні мясцкома БДУ разгледжана пытанне аб кіраўніцтве сацыялістычным спаборніцтвам калектываў кафедр, аддзелаў, факультэтаў БДУ ў гонар XXIV з'езда КПСС. Адзначана станоўчая работа па выкананню прынятых сацыялістычных абавязацельстваў, адпаведна якім ідзе ўдасканаленне навучальнага працэсу, пашыраецца навуковая дзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў, укараняюцца ў вытворчасць дасягненні навукі. Каб вынікі сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар з'езда былі яшчэ больш адчувальныя, мясцком у прынятай пастанове намеціў спецыяльныя меры па кіраўніцтву спаборніцтвам.

Прафсаюзным бюро ўсіх факультэтаў, адміністрацыйнай і гаспадарчай часткі прапанавана стварыць цэнтры па кіраўніцтву ходам выканання сацыялістычных абавязацельстваў. На вытворчых нарадах прафарганізацый прызнана неабходным абмеркаваць, як выконваюцца мерапрыемствы па дастойнай сустрэчы з'езда. Уводзяцца ў практыку пасяджэнняў усіх прафбюро перыядычныя справаздачы аддзелаў і кафедр аб выкананні запланаваных мерапрыемстваў.

Каардынуючым цэнтрам кіраўніцтва спаборніцтвам у гонар з'езда зацверджана вытворчая камісія мясцкома.

## АДПАВЕДНА АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАМ

У нашым універсітэце шырока разгарнуўся патрыятычны рух пад дэвізам «XXIV з'езду КПСС — дастойную сустрэчу!» Уключыліся ў яго і члены ДТСААФ БДУ. Думкі і справы іх накіраваны на тое, каб унесці найбольшы уклад ва ўмацаванне абароннай магутнасці Савецкай Айчыны. Свята захоўваючы запаветы У. І. Леніна, указанні Камуністычнай партыі, мы бачым свой важнейшы доўг у тым, каб быць заўсёды напагатове, праяўляць няспынную пільнасць, павышаць сваю гатоўнасць да ўзброенай абароны Радзімы.

У перыяд падрыхтоўкі да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна арганізацыя ДТСААФ нашага універсітэта дабілася значных поспехаў. Прыкметна актывізавалася дзейнасць арганізацый ДТСААФ факультэтаў. Узмацнілася прапаганда ваенных і ваенна-тэхнічных ведаў сярод студэнтаў і супрацоўнікаў. Добра працавалі гурткі: аўтамабільны (кіраўнік Л. В. Новаш), матацыклетны (В. А. Бародкін), парашутны (В. Доктараў) і стралковыя гурткі хімічнага, матэматычнага, гістарычнага і фізічнага факультэтаў. Каманды універсітэта па ваенным мнагабор'і, фігурнаму ваджэнню матацыкла і радыётэлеграфісты занялі першыя месцы на 5-й спартакіядзе па ваенна-прыкладных і тэхнічных відах спорту Кастрычніцкага раёна г. Мінска.

Імкнучыся дастойна сустрэць XXIV з'езд КПСС, арганізацыя ДТСААФ разгарнула сацыялістычнае спаборніцтва за дасягненне лепшых паказчыкаў у абаронна-масавай рабоце і патрыятычным выхаванні студэнтаў і супрацоўнікаў. Па яе ініцыятыве арганізуюцца паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа, наведанне музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і іншых памятных мясцін, правядзенне тэматычных вечароў, вечароў-сустрэч з ветэранамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, Героямі Савецкага Саюза.

У прынятых абавязацельствах прадугледжана правядзенне лекцый і гутарак па ваенна-патрыятычнай тэматыцы, сустрэч студэнтаў з воінамі падшэфных часцей, усямернае развіццё ваенна-прыкладных і тэхнічных відаў спорту, чаму будуць садзейнічаць сістэматычныя спаборніцтвы па ваенна-прыкладных відах спорту на першынство факультэтаў і універсітэта.

У цяперашні час абавязацельствы ператвараюцца ў жыццё. Ідуць заняткі ва ўсіх гуртках ДТСААФ. Праведзены першыя ў гэтым навучальным годзе спаборніцтвы па кулявой стральбе на першынство універсітэта. Лепшых вынікаў дабіліся стралкі фізічнага, геаграфічнага і хімічнага факультэтаў. А вось на факультэце журналістыкі пакуль што дрэнна абстаяць справы са стралковым спортам.

Падыходзяць да канца спаборніцтвы па кулявой стральбе на ваеннай кафедры.

У кастрычніку адбылася цікавая сустрэча студэнтаў-выдатнікаў з воінамі падшэфнай часці. А студэнты-філолагі нядаўна былі ўдзельнікамі вечара «Баявыя сцягі расказваюць», на якім выступілі ўдзельнік абароны Брэсцкай крэпасці П. Е. Сіўкоў і праслаўлены партызанскі камандзір С. Г. Сідарэнка-Салдаценка.

У гонар дня Ракетных Войск і Артылерыі праводзіцца тыдзень абаронна-масавай работы. Перад студэнтамі выступаюць праслаўленыя воіны-артылерысты генерал-лейтэнант артылерыі І. С. Жыгараў, палкоўнік запасу А. С. Мізрахі і афіцэры артылерыйскіх падраздзяленняў.

Актыўны ўдзел кожнага члена ДТСААФ у абаронна-масавай рабоце — залог паспяховага выканання сацыялістычных абавязацельстваў у гонар XXIV з'езда нашай партыі.

**М. ГАРЛАТАЎ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ БДУ.**

## ДЗЕНЬ СТУДЭНЦКАЙ САЛІДАРНАСЦІ

**Штогод 17 лістапада студэнты розных краін свету адзначаюць Міжнародны дзень салідарнасці. 31 год мінуў з таго часу, калі чэшскія студэнты адкрыта выступілі супраць фашызму. Моцная дэманстрацыя студэнтаў была расстраляна. Удзельнікі яе кінуты ў турмы.**

**У 1941 годзе ў Лондане Студэнцкі камітэт краін антыгітлераўскай кааліцыі адзначаў гэту дату як дзень салідарнасці студэнтаў у барацьбе супраць фашызму. А ў 1946 годзе быў створан Міжнародны Саюз студэнтаў, які пацвердзіў гэту дату, і яна штогод адзначаецца як Міжнародны дзень студэнтаў.**

**Вось кароткая біяграфія свята, на якое сабраліся 17 лістапада ў Палацы прафсаюзаў студэнты вну сталіцы Беларусі.**

**Урачысты вечар адкрыў прадстаўнік камітэта маладзёжных арганізацый БССР В. А. Харловіч. Ён шчыра прывітаў студэнцтва са знамянальным святам, пажадаў поспехаў у вучобе.**

**Ад імя в'етнамскіх студэнтаў выступіў Чонг В'ет Хунг, студэнт V курса фізфака БДУ.**

**— В'етнамскія студэнты,—сказаў ён,— заўсёды імкнуцца, каб дружба з савецкімі студэнтамі была непахіснай.**

**Гарачымі воплескамі сустрэлі прысутныя песні венесуэльскага юнака Архангела Бэсэнра.**

**Палымяныя словы аб дружбе і салідарнасці моладзі сказаў Вольфганг Тойберг з ГДР.**

**Пранікнёна прагучала патрыятычная прамова нашага студэнта Жака Антуана Амідзі (Ліван), у сэрцах кожнага знайшоў водгук заклік да адзінства моладзі ў барацьбе з міжнародным імперыялізмам.**

**Гарачымі воплескамі віталі студэнты і венгра Боршане Імрэ, і французжанку Жані Маганьёз, і алжырца Ясіна Нуары, і савецкага студэнта Пятра Вакульчыка, і многіх іншых.**

**З урачыстага вечара была адпраўлена прывітальная тэлеграма Міжнароднаму Саюзу студэнтаў.**

**У заключэнне перад студэнтамі выступіў эстрадны вакальна-інструментальны ансамбль політэхнічнага інстытута «Афрыканас».**

**В. РАДКЕВІЧ,**
**студэнтка.**

## ЭКСКУРСІЯ АКТЫВІСТАЎ

Нядаўна прафком універсітэта арганізаваў двухдзённую экскурсію прафсаюзных актывістаў у горад Брэст.

У першы дзень падарожжа 26 студэнтаў матэматычнага, юрыдычнага, хімічнага і іншых факультэтаў пабывалі каля Белай вежы ў г. п. Камянцы, агледзелі запаведнік Белавежскай пушчы. Другі дзень быў прысвечан агляду Брэсцкай крэпасці-героя, музеяў і іншых славутасцей старажытнага горада.

**С. МІШУХІН.**

## ВЫСТАЎКІ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

«Беларусь насустрач XXIV з'езду КПСС» — так называецца выстаўка, якую падрыхтавалі работнікі універсітэцкай бібліятэкі. Тут ёсць пастанова ЦК КПСС, прынятая 13 ліпеня 1970 года «Аб скліканні чарговага XXIV з'езда КПСС», даклад П. М. Машэрава на пленуме ЦК КПБ «Аб выніках ліпеньскага Пленума ЦК КПСС і чарговых задачах Камуністычнай партыі Беларусі ў галіне сельскай гаспадаркі», кнігі, прысвечаныя нашай рэспубліцы (выдавецтва «Беларусь»): «Па Ільічу раўняючы крок», «У братняй сям'і народаў» Ц. Кісялёва, «Мая Беларусь» Тараса Хадкевіча, а таксама шмат артыкулаў аб працоўных поспехах, з якімі беларусы рыхтуюцца сустрэць XXIV з'езд КПСС.

* * *

150-годдзю з дня нараджэння вялікага мысліцеля рэвалюцыі Фрыдрыха Энгельса прысвечана яшчэ адна кніжная выстаўка ў бібліятэцы. На ёй прадстаўлены вядомыя творы Энгельса, а таксама шмат літаратуры аб яго жыцці і творчай дзейнасці.

* * *

Задоўга да пачатку гэтага навучальнага года супрацоўніца нашай бібліятэкі Валянціна Непачаловіч сабрала і цікава аформіла выстаўку «У дапамогу першакурсніку». Тут ёсць кнігі, брашуры, артыкулы. Іх аўтары знаёмяць студэнтаў малодшых курсаў з тым, як хутчэй знайсці патрэбную кнігу, працаваць над ёй, даюць парады па вывучэнню твораў класікаў марксізма-ленінізма і інш.

Асаблівым попытам першакурснікаў карыстаюцца брашуры Н. Г. Кушкова «Арганізацыя самастойнай работы студэнта», Г. Дзяборына «Састаўленне канспекта», В. Дабрахотава «Як працаваць з кнігай», «Метадычныя парады па вывучэнню твораў Леніна».

**З. КАЛЕСНІКАВА.**

# ВЫПРАБАВАННЕ

*У час летніх канікул і ў першыя месяцы гэтага навучальнага года некалькі груп студэнтаў нашага універсітэта пабывала на вытворча-азнаямленчай практыцы ў братніх сацыялістычных краінах. Аб тым, як праходзіла практыка, што цікавага ўбачылі нашы юнакі і дзяўчаты за мяжой, вы даведаецеся з гэтага артыкула.*

## ПРАКТЫКА ПРАЙШЛА ПАСПЯХОВА

ДЗЕВЯЦЬ студэнтаў-філолагаў на чале з кіраўніком групы А. М. Шыловічам ездзілі ў Польскую Народную Рэспубліку.

Першыя дні былі да краёў запоўнены захапляючымі экскурсіямі і паездкамі. Спачатку студэнты азнаёміліся з прыгажуняй Варшавай: наведалі палац Вільянаў, парк і палац у Лазенках, Палац навукі і культуры, могілкі савецкіх воінаў. Потым — Кракаў. Былі ў Вавелі, у мастацкім музеі, у славутых саборах горада. Але больш за ўсё ўсхвалявалі і ўразілі рабят Асвенцым.

Вельмі цікавай і карыснай была экскурсія па ленінскіх мясцінах: пабывалі ў Пароніне, Белым Дунайцы, падымаліся ў горы, дзе любаваліся возерам Марское Вока, заехалі ў Закапане.

8 жніўня група прыбыла ў Астравец, дзе знаходзіўся моўны лагер. Тут нашы юнакі і дзяўчаты займаліся з польскімі студэнтамі, дапамагалі ім рыхтавацца да чарговых заняткаў, састаўлялі дыялогі, кантралявалі чытанне мастацкіх тэкстаў.

У вольны час беларускія і польскія студэнты развучвалі песні, чыталі вершы, рыхтавалі вечары мастацкай самадзейнасці, гутарылі аб жыцці студэнцкай моладзі ў Савецкім Саюзе і Польшчы, аб выкладанні рускай мовы ў школах, аб літаратуры і мастацтве братніх краін.

Польскія сябры акружылі членаў нашай групы ўвагай і клопатамі, стараліся як мага больш паказаць цікавага. З гэтай мэтай і былі арганізаваны экскурсіі ў Сандамезс, Баранаў, Свянтокшыскія горы, Кшэменкі. У адказ на гэтую цеплыню і шчырыя клопаты савецкія студэнты падарылі польскім сябрам прыгожы вымпел са шматлікімі беларускімі значкамі. А яшчэ члены нашай групы С. Васілёнак, В. Калякаў, А. Курэйка, Л. Пеціна, Е. Валынец, Т. Парватава разам са студэнтамі Маскоўскага абласнога педінстытута паставілі кампазіцыю, прысвечаную У. І. Леніну.

Цікава праходзілі вечары, дзе студэнты выконвалі беларускія народныя песні, танцы, чыталі вершы, расказвалі аб жыцці і творах Янкі Купалы, Якуба Коласа, шмат гаварылася і пра сучасную нашу літаратуру, пра маладых паэтаў і пісьменнікаў Беларусі.

ВЫТВОРЧАЯ практыка студэнтаў фізфака пад кіраўніцтвам дацэнта А. І. Камяка праходзіла ў лабараторыі секцыі фізікі Іенскага універсітэта Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. У час практыкі студэнты падрабязна азнаёміліся з лабараторнымі задачамі пачатковага практыкума і лабараторнымі работамі для студэнтаў IV курса. На працягу васьмі дзён студэнты выконвалі свае заданні. Работа вялася вельмі шырока, ахоплівала некалькі сумежных галін фізікі: радыётэхніку, оптыку, спектраскапію, фотаметрыю. Усё гэта патрабавала глыбокіх практычных і тэарэтычных ведаў. Практыкум прайшоў паспяхова. Усе студэнты справіліся з пастаўленымі задачамі. Трэба адзначыць, што супрацоўнікі лабараторый вельмі добра адносіліся да нашых студэнтаў і ў многіх незразумелых пытаннях ахвотна прыходзілі ім на дапамогу.

Адначасова савецкія юнакі і дзяўчаты цікавіліся тэмамі работ дыпломнікаў, жыццём і вучобай нямецкіх студэнтаў і аспірантаў. Азнаёміліся з цудоўнымі лекцыйнымі заламі, дзе лекцыя поўнасцю трансліруецца па тэлебачанні, запісваецца на відыёмагнітафон і ў любы момант можа быць яшчэ раз праслухана.

Нашы будучыя фізікі наведалі навукова-даследчыя інстытуты універсітэта імя Ф. Шылера. Яны пазнаёміліся з іёнаметрычным аддзелам секцыі фізікі, які ўзначальвае прафесар Мюллер— буйны тэарэтык. Ён адначасова займаецца пытаннямі каардынацыі навукова-даследчай работы на фірме Карл Цэйс і ва універсітэтах Іены і Дрэздэна. Прафесар расказаў аб галоўных кірунках работы секцыі фізікі, адзначыў, што ўсё больш увагі цяпер удзяляецца сувязі тэорыі з практыкай, сумеснай рабоце інстытутаў з заводамі па стварэнню новых прыбораў і распрацоўцы тэхналагічных працэсаў.

Цікавым было знаёмства з даследаваннямі ў аддзеле нелінейнай оптыкі, высокачастотнай спектраскапіі, а таксама з лабараторыяй рэнтгенаструктурнага аналізу, якой кірус прафесар Унгстон. Лабараторыі вельмі добра абсталяваны сучаснай апаратурай з аўтаматычнай рэгістрацыяй фізічных параметраў.

Зразумела, што студэнты мелі дастаткова вольнага часу. У інтэрнаце яны часта збіраліся разам з нямецкімі студэнтамі, спявалі песні, вялі дыспуты. Некалькі разоў былі на вечары адпачынку і танцаў у студэнцкім клубе. Адпраўляліся і на экскурсіі. Спачатку па горадзе Іена. Агледзелі музеі, планетарый, заводы фірмы Карл Цэйс.

Акрамя Іены, наша студэнцкая група наведала Лейпцыг — вялікі культурны, гандлёвы і прамысловы цэнтр ГДР. Тут будуецца шмат новых высотных дамоў, узводзіцца універсітэт. Агледзелі гістарычныя помнікі, некаторыя гандлёвыя палаты Лейпцыгскай ярмаркі, музеі, бібліятэкі, памятныя мясціны, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Гейнэ і Баха.

Незабыўнай была паездка ў Веймар, назаўсёды звязаны з вялікімі імёнамі Гётэ, Шылера, Ліста. Гэта горад тэатраў, цудоўнай архітэктуры. І вось паблізу ад гэтага сусветна вядомага помніка нямецкай культуры знаходзіцца былы канцлагер Бухенвальд. Стварэнне падобных лагераў смерці засталося цёмнай плямай у гісторыі нямецкай нацыі. І гэта добра разумеюць тыя немцы, з якімі даводзілася сустракацца нашым студэнтам.

НЯДАЎНА на геаграфічным факультэце адбылося пасяджэнне студэнцкіх гурткоў кафедр фізічнай і эканамічнай геаграфіі замежных краін. У ім прынялі ўдзел Валянціна Ларына, Святлана Круглова, Леанід Дземідовіч, Святлана Рэпіч, Дзіяна Малеева і Віктар Касцюкевіч, студэнты IV курса, якія ў час летняй вытворчай практыкі пабывалі ў Венгерскай Народнай Рэспубліцы. Мэтай практыкі было азнаямленне з прыродай Венгрыі, яе гаспадаркай, культурай і бытам народа. У паездках па краіне іх суправаджаў выкладчык кафедры эканамічнай геаграфіі Будапешцкага універсітэта.

Вось што расказалі ўдзельнікі паездкі на пасяджэнні:

— Перш чым адправіцца ў падарожжа па краіне, беларусы праслухалі лекцыю аб фізіка-геаграфічных асаблівасцях і асноўных рысах гаспадарчага развіцця ВНР. Студэнты пазнаёміліся з найбольш цікавымі ў прыродных адносінах раёнамі Венгрыі, наведалі Задунайскае Сярэднягор'е. Тут агледзелі возера Балатон — буйнейшы вадаём Заходняй Еўропы і акаймляючую яго з поўначы сістэму Баконь. Узыходзілі на самую прыгожую гару акругі Балатона — Бадачонь. Прыцягнулі ўвагу шматлікія тэрмальныя крыніцы, сярод якіх было і самае вялікае ў Еўропе возера з гарачай вадой, маючай лекавыя ўласцівасці. На яго берагах размешчаны шматлікія рэўматалагічныя лячэбніцы, што працуюць увесь год, бо тэмпература вады не апускаецца ніжэй 22 градусаў.

На Балатоне студэнты БДУ азнаёміліся з пастаноўкай навукова-даследчай работы па вывучэнню гідралагічных асаблівасцей і біялогіі вадаёма, пабывалі ў навукова-даследчым інстытуце АН Венгрыі і на гідралагічнай станцыі Інстытута воднай гаспадаркі.

— Пабывалі мы таксама і на крайняй поўначы рэспублікі ў старадаўняй сталіцы Венгрыі і ў самым вузкім месцы даліны ракі Дунай ля горада Віцеграда. У апошнія дні зрабілі невялікае падарожжа ў міжрэчча Дуная і Цісы — адзін з асноўных земляробчых раёнаў краіны.

— У перыяд практыкі вялікая ўвага ўдзялялася знаёмству з гаспадаркай Венгрыі. Мы наведалі буйнейшыя прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы: завод «Ікарус», які спецыялізуецца на выпуску аўтобусаў, кансервавы завод «Глобус» у г. Кечкемет, 60 працэнтаў прадукцыі якога паступае ў СССР, завод па вытворчасці эфірных маслаў у Ціхані і іншыя прадпрыемствы. Агледзелі плантацыі вінаграду, араматычных кустоў лаванды і шалфею, міндаля, грэцкага арэха, персікаў і г. д.

— Венгрыя—краіна багатага гістарычнага мінулага. Знаёмства з ім пачалося ў Будапешце. Сталіца ВНР дэманструе сваім наведвальнікам мноства помнікаў.

— Хочацца дадаць, што ў перыяд нашага знаходжання ў ВНР, краіна адзначала тысячагоддзе Венгерскай дзяржавы, дзень Канстытуцыі і свята новага хлеба. У гонар гэтага ў Будапешце адбыліся вялікія водныя прадстаўленні на Дунаі, святочныя феерверкі і масавыя гулянні, сведкамі якіх былі і мы.

# ЗА САБОЙ ВЯДЗЕ ВАЖАТЫ

**Кожны год больш 300 студэнтаў філалагічнага і гістарычнага факультэтаў праходзяць піянерскую практыку. У загарадных і гарадскіх піянерскіх лагерах, піянерскіх пакоях пры домакіраўніцтвах, на дзіцячых аздараўленчых пляцоўках, у школах усенавуча і школах санаторнага тыпу, міжкалгасных піянерскіх лагерах рэспублікі можна сустрэць студэнтаў універсітэта. Яны выкарыстоўваюць шырокія магчымасці для арганізацыі карыснага адпачынку і ўмацавання здароўя дзяцей і ў той жа час прывіваюць ім працоўныя, турысцкія навыкі, развіваюць пачуццё калектывізму, пашыраюць кругагляд, паглыбляюць веды дзяцей аб роднай прыродзе, камуністычным будаўніцтве ў нашай краіне.**

**Многія з практыкантаў умела арганізуюць работу піянераў і школьнікаў у атрадах з улікам узросту, інтарэсаў, удзяляюць шмат увагі выхаванню высокіх маральных якасцей на прыкладзе жыцця і дзейнасці У. І. Леніна, рэвалюцыйных і працоўных традыцый савецкага народа.**

У час турысцкіх паходаў па месцах баявой і працоўнай славы нашага народа студэнты арганізуюць сустрэчы рабят з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, з ветэранамі працы, праводзяць кастры на месцах партызанскіх стаянак.

Разам са студэнтамі-важатымі адпраўляюцца ў паходы «зялёныя патрулі» і звенні юных натуралістаў. Пад кіраўніцтвам важатых рабяты ахвотна працуюць па добраўпарадкаванню лагера, дапамагаюць калгасам і саўгасам ва ўборцы ўраджаю. З захапленнем збіраюць матэрыялы для школьных краязнаўчых музеяў.

У час летняга працоўнага семестра нашы студэнты арганізуюць лагеры-спадарожнікі і вядуць у іх цікавую піянерскую работу. І не выпадкова гэты від студэнцкай дзейнасці аказваецца не менш удзячным, чым будаўніцтва або дапамога сельскім працаўнікам. Так, толькі ў сёлетнім годзе 50 студэнтаў універсітэта ўзнагароджаны граматамі, больш 50 ўдастоены падзяк і памятных падарункаў.

Асаблівай пахвалы заслугоўваюць такія студэнты, як П. Краўчанка, Я. Навіцкая, А. Кошман, О. Коршунава, І. Шкраба, Т. Кісель, О. Лютава, Г. Марчык, Т. Пятровіч, А. Іванова і іншыя. Студэнтцы С. Раманенка дзякуе не толькі педагог-арганізатар домакіраўніцтва № 17 г. Мінска, але і бацькі дзяцей. Цёпла адклікаюцца бацькі і аб рабоце студэнтак С. Ганчаровай і Л. Рудзь.

Ужо многа год студэнты дапамагаюць у рабоце з піянерамі і школьнікамі педагогу-арганізатару пры домакіраўніцтве № 3 г. Мінска А. Ліўшыц. Вось і ў мінулым годзе група трэцякурснікаў беларускага аддзялення філфака В. Шэлест, Л. Кахновіч, У. Танан, М. Жоль, М. Тараскевіч і іншыя правялі вялікую работу з піянерамі і школьнікамі да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна: аформілі стэнды «Вобраз Леніна ў беларускім выяўленчым мастацтве», «Ульянаўск — горад Леніна», правялі многа гутарак, сумесна з рабочымі завода імя Кірава ўдзельнічалі ў арганізацыі ўрачыстага сходу, прысвечанага ленінскаму юбілею.

Добра зарэкамендавалі сябе студэнты, якія працавалі ў міжкалгасных піянерскіх лагерах: З. Гардзей, Н. Юрчык, Л. Талалава, Л. Грышанава і іншыя.

Заўсёды юныя ў піянерскім страі нашы выкладчыкі, аспіранты, такія, як М. А. Шэйнеман, Я. Л. Прыбыткова, М. З. Яноўскі, Е. І. Калеснік, В. С. Клімовіч і іншыя.

Аднак у арганізацыі і правядзенні піянерскай практыкі ёсць і цяжкасці, і недахопы. Так, трэці курс перагружан вучэбнымі заняткамі, таму цяжка праводзіць семінар па падрыхтоўцы важатых. Лагеры Мінскай вобласці не могуць забяспечыць студэнтаў платнымі пасадамі, таму універсітэт праводзіць практыку ў межах рэспублікі па заяўках гаркомаў і райкомаў камсамола.

Пасля практыкі асобныя студэнты са спазненнем здаюць справаздачы, пры напісанні рэфератаў слаба раскрываюць змест тэмы, не выкарыстоўваюць фактычны матэрыял і г. д.

Саветы гістарычнага і філалагічнага факультэтаў, кафедра педагогікі і псіхалогіі павінны ўдзяліць больш ўвагі тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўцы студэнтаў да самастойнай работы важатага, устанавіць больш цесную сувязь з базамі практыкі, каб юбілейны год універсітэта і 50-годдзе піянерскай арганізацыі азнаменаваліся новымі поспехамі.

**К. БАРТАШ,**
**загадчык педагагічнай практыкі.**



*НА ЗДЫМКУ: піянерскі лагер «Зялёны бор». У цэнтры — студэнтка-практыкантка III курса аддзялення рускай мовы і літаратуры філфака А. Іванова.*

# ВЕДАЎ

## О, НАРАЧ, НАРАЧ!..

Першая практыка... Яна напэўна добра запомнілася кожнаму студэнту. Задоўга да пачатку яе «першакі» (традыцыйная назва першакурснікаў) даведаліся ў «старых»: што, як, дзе, чаму. Хваляваліся і мамы: на сем тыдняў адправіць дзіця невядома куды... на Нарач. І не кожная з іх спакойна рашалася на гэта.

І вось настаў доўгачаканы дзень. Сесія засталася ззаду, а да наступнай яшчэ так далёка. Наперадзе — практыка, канікулы... Нагружаныя да адказу сумкамі, сеткамі і скруткамі, клункамі і клуначкамі, сабраліся мы ля дзвярэй нашага корпуса, які надоўга збіраліся пакінуць.

Едзем! Як гэта здорава — жыць у лесе ля самага возера, уставаць кожны дзень разам з сонцам і мыцца сцюдзёнай празрыстай вадой!.. Гэтымі светлымі марамі была ахоплена добрая палова курса. Праўда, к канцу практыкі гэтыя рамантычныя думкі рассеяліся «як сон, як ранішні туман». І менавіта ж ранішні сон лічыўся вышэйшай асалодай нароўні са смачным абедам.

Нарач сустрэла нас непрыветліва. З цяжкіх сасновых галінак капала, неба было шэрае і пахмурнае, а возера... Нават пры адной думцы аб купанні прабіралі дрыжыкі.

На наступны дзень з'явілася сонейка, і аказалася, што ўвогуле ўсё не так і дрэнна, як здавалася: і возера, і сосны, і домікі...

Пачаліся заняткі, а разам з імі — новыя клопаты і турботы. Не так проста, як здаецца, набраць 50 відаў, таму што калі табе трэба дабраць нехапаючыя да запаветнай колькасці некалькі штук, усе беспазваночныя правальваюцца як скрозь зямлю, а траўкі-мураўкі злізвае якая-небудзь карова. І тады дарэмныя ўсе намаганні знайсці тое, што патрэбна. А тут, як на зло, курортнікі, як толькі ўбачаць студэнта, які сунецца, панура апусціўшы галаву, з сачком і банкай, у якой цямнее адзін малюск, так і крычаць яму радасна ўслед: «Эй! Сачок! Многа лягушак налавіў?!» Дзіўна: чамусьці заўсёды ў іх студэнт з сачком асацыіруецца з лягушкай. А ім, непасвечаным, і не зразумець, што мы, можа, з гэтым сачком ужо «прачасалі» вярсту-другую лесу, што нашы каленкі крыватучаць.

Эх, што ні кажы, дарага нам дастаюцца гэтыя «маляўкі-казяўкі» і «цвяточкі-васілёчкі» (жаргон назіраючай публікі). Але варта здаць залік—і патрэбныя «віды» з'яўляюцца ў такой колькасці, што іх хапіла б яшчэ на некалькі курсаў. Дарэчы, заўсёды было на што зваліць свае няўдачы. Яны матываваліся ў асноўным дзвюма прычынамі: а) да нас тут былі вячэрнікі і завочнікі—хіба ж пасля іх што-небудзь застанецца? Ды і біястанцыі гадоў нямала; б) першая генерацыя ўжо была, а другая яшчэ будзе — дзе ж узяць віды?

Колькі адчаю было на твары «шчаслівчыка», які толькі што злавіў «від» і выпусціў яго!.. А якая гама пачуццяў пры знаходцы невядомага экземпляра! Тут і радасць —«Яшчэ адзін, ды які!», тут і сумненні —«Можа, не браць?.. Падазроны ён нейкі, не вызначу яшчэ, вазіся з ім», і гордасць—«Ага-а, што ў мяне ёсць!», і страх —«А раптам цяпне за палец!» Нарэшце ахвяра засаджана ў марылку і ўрачыста перанесена ў лабараторыю. З гэтага пачынаюцца асноўныя клопаты, таму што «від» не распраўляецца і не засушваецца, а пад канец... і не вызначаецца. Калі ўсё застаецца ззаду, новы, цудоўны экземпляр раптам з ціхім трэскам рассыпаецца на драбнюткія кусочкі, і на тарфушцы сіратліва тырчыць пустая шпілька... Усё пачынаецца спачатку...

Для прафілактыкі, напэўна, надвор'е нас ахутвала холадам і палівала дождджыкам. А вось у дні падрыхтоўкі да залікаў яно змяніла сваю тактыку, стала такім прыемным, такім цудоўным, што нельга было выстаяць супраць усіх спакус прыроды. Але мы выстаялі і з гонарам здалі свае «віды» і «экземпляры» з усёй экалогіяй, лацінню і г. д.

Свята Нептуна прыйшлося на пахмурны, даждждлівы дзень, але гэта не перашкодзіла выкупаць палавіну курса ў ледзяной вадзе «ў поўным абмундзіраванні». Не ратавала нічога: ні адгаворкі, што холадна, што трэба дзяжурыць на кухні, ні барыкады ля дзвярэй і палатак, ні фізічная сіла. Чалавек, які трапіў у лапы «мачальнікаў», мог прасіць, пагражаць, брыкацца, кусацца —але ўсё дарэмна...

Пасля гэтых прамочак некаторыя яшчэ доўга чыхалі, але крыўды ні ў кога не было. Усе вырашылі: пры першай жа магчымасці паўтарыць свята яшчэ раз...

Аб уражаннях практыкі можна пісаць многа. Хочацца яшчэ дабавіць, што ў Налібоцкую пушчу мы паедзем ужо вопытнымі людзьмі, якія ведаюць, што да чаго!

**Д. ЮНУСАВА,**
**студэнтка II курса біяфака.**

**Якіх толькі прыгод не здаралася са студэнтамі-журналістамі, якіх толькі падзей не нагледзеліся яны за час сваёй практыкі ў рэдакцыях газет, радыё і тэлебачання! І як слаўна аб усім гэтым яны напісалі ў сваіх дзённіках, справаздачах, матэрыялах! А каб наш чытач меў аб усім гэтым крыху лепшае ўяўленне, студэнт II курса М. Інін вырашыў сёе-тое з-пад пяра сваіх калег праілюстраваць.**



*«Калгаснікі называюць А. Тупенку патрыётам. Летась ён атрымаў ад кожнай аўцаматкі па 1,24 ягняці, настрыг па 2,7 кілаграма воўны ад кожнай галавы.* Т. ВАШЧАНКА. (З матэрыялу).



*«Пасля абеду вырашылі адправіцца па другому заданню. Ледзьве знайшлі домакіраўніцтва. Аказваецца, яго перанеслі з гасцініцы ў будынак пажарнай».* А. ЛАМЕКА. (З дзённіка).



*«Уладзімір Сяргеевіч пазнаёміў мяне з Нінай Несцяровіч, медыцынскай сястрой дзіцячага аддзялення, з тым, каб яна пазнаёміла мяне з ім».* Г. ГЛАДКАЯ. (Са справаздачы).



*«Праўда, падкарацілі мяне амаль удвая».* В. ЯРОХІНА. (Са справаздачы).



*«Нарыс пра яе не паспеў напісаць— апрадзілі калегі».* Б. ЯБЛОНСКІ. (Са справаздачы).

# ЧАРГОВАЯ СПРОБА СІЛ

Калі параўнаць мінулагоднюю вучэбную практыку з сёлетняй, то можна смела сказаць, што апошняя прайшла значна лепш. Гэта сведчыць аб тым, што практыканты больш сур'ёзна аднесліся да гэтага важнага перыяду вучобы. Яшчэ задоўга да пачатку яго кафедра сумесна з камітэтам па тэлебачанню і радыёвяшчанню Савета Міністраў БССР вызначылі базавыя камітэты. Для трэцякурснікаў асноўнай базай былі Гомельская, Віцебская, Брэсцкая тэлестудыі і рэдакцыі радыёвяшчання. У гэтых калектывах нашы студэнты праходзяць практыку не першы раз. Прыемна, што сёлета іх тут добразычліва сустрэлі, уважліва і чула аднесліся да будучых тэле- і радыёжурналістаў, стварылі неабходныя ўмовы для плённай працы. Асабліва хочацца адзначыць і выказаць шчырую падзяку калектывам Віцебскага і Гомельскага абласных камітэтаў па тэлебачанню і радыёвяшчанню.

Вядома, што стварэнне неабходных умоў для плённай працы мае вялікае значэнне. Але галоўнае — гэта адносіны саміх студэнтаў да практыкі. І хто з жаданнем узяўся за справу, хто рашыў паспрабаваць свае сілы ў галіне тэле- і радыёжурналістыкі, той, не губляючы ніводнай гадзіны, прыступіў да работы. І хутка ў эфіры з'явіліся цікавыя матэрыялы, змястоўныя тэлеперадачы нашых студэнтаў. А такіх выступленняў нашых практыкантаў, асабліва з трэцяга курса, было многа.

Калі параўнаць, якія ацэнкі атрымалі студэнты за вучэбную практыку, то зноў прыходзіцца адзначыць, што на гэты раз больш выдатных і добрых адзнак. Сёлета лепш былі зроблены справаздачы практыкантаў, разгляд практыкі.

Практыка закончана. Ужо даўно ідуць заняткі. Але сёння трэба думаць аб новай спробе сваіх сіл. Думаць і да яе рыхтавацца.

М. ДАСТАНКА,
загадчык кафедры РТ.



*«Работай у аддзеле мяне не абцяжарвалі. Усё аглядаў навокал: чаго б гэта такога напісаць. Залез нават у царкоўны купал». (Са справаздачы).*




*«Прыехала, вымылася, выграбла кучу пяску і пылу — і зноў у рэдакцыю».* Н. МЫЛЬЦАВА. (З дзённіка).

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

# ПАТРАБУЕ ЧАС

Хоць пасля пленума камітэта камсамола прайшоў некаторы час, спрэчкі ўсё працягваюцца.

Аляксандр Калымага, член камітэта камсамола, дакладваў пленуму аб стане работы акадэмічнага сектара. Яна вялася ў наступных напрамках: работа па прафесійнай арыентацыі моладзі; работа з першакурснікамі; паляпшэнне наведвання лекцый, падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў; работа са студэнтамі-выдатнікамі.

Камсамольская арганізацыя універсітэта, акадэмічны сектар камітэта імкнуцца, каб новае папаўненне моладзі, што прыходзіць кожны год у жніўні месяцы, было дастойным звання студэнта вну. З гэтай прычыны сёлета была створана грамадская прыёмная камісія. Яе члены выязджалі ў раёны, чыталі лекцыі па гісторыі БДУ і па прафіліруючых дысцыплінах, расказвалі аб спецыяльнасцях, якія можна набыць на розных факультэтах, дапамагалі будучым абітурыентам аформіць дакументы. І гэта не адзіны крок у такім напрамку: у кастрычніку 1969 года пачалі дзейнічаць падрыхтоўчыя курсы на грамадскіх пачатках. Вучні старэйшых класаў займаліся ў школах юных фізікаў, хімікаў, матэматыкаў, літаратараў.

Асаблівую ўвагу камсамольская арганізацыя надае першакурснікам. Добра, што размова пачалася не пасля сесіі, калі заліковыя кніжкі запоўняцца рознымі адзнакамі.

Пленум адобрыў работу кансультацыйных пунктаў для першакурснікаў, якія існавалі ў мінулым навучальным годзе, і пастанавіў аднавіць іх.

А калі выкладчык, адчайна ўздыхнуўшы, усё ж паставіць нездавальняючую адзнаку, што рабіць з уладальнікам двойкі? Выказваліся рэзкія думкі. Жадаючых паступіць ва універсітэт многа. І калі чалавек, прайшоўшы праз усе выпрабаванні, стаў студэнтам, яму нельга дараваць дрэннай вучобы. Толькі выключаць, бо грамадству не патрэбны спецыялісты недавучаныя, спецыялісты без любві да сваёй працы.

І другая думка. З першакурснікамі ўсё можа здарыцца. Маладыя людзі памянялі месца жыхарства, а яно не заўсёды добра ўладкавана, некаторыя прывыклі да кантролю, а тут — самастойнасць, ды і сістэма навучання адрозніваецца ад школьнай. Гэтыя і іншыя прычыны могуць прывесці да дрэнных вынікаў. У такім выпадку лепш не спяшацца.

Але вось першы курс пройдзен. Ці значыць гэта, што акадэмічнаму сектару няма чаго рабіць? Тут таксама існуюць свае праблемы. Ці магчыма свабоднае наведванне лекцый? Ці патрэбна яно?

Аргументы за: студэнт атрымлівае дадатковы час для самастойнай работы, у яго з'яўляецца магчымасць абганяць вучэбны курс і г. д. Галасы супраць: студэнт не зможа рыхтавацца толькі па падручніках, бо выкладчыкі ў лекцыях даюць шмат новага матэрыялу, які канцэнтруе вынікі навуковай работы; студэнт, атрымаўшы магчымасць свабодна наведваць лекцыі, астыне да вучобы і г. д.

Матэрыял для спрэчак багаты. Многае патрэбна ўзважыць, праверыць часам. І камітэт камсамола запрашае прыняць удзел у абмеркаванні праблем акадэмічнай работы.

Пленум камітэта камсамола прыняў пастанову, у якой улічаны недахопы. Мяркуецца правесці інструктыўную нараду адказных за акадэмічны сектар, агітпаход па школах Мінскай вобласці, у сакавіку павінен адбыцца II злёт выдатнікаў.

**М. АНДРЭЕЎ.**

# ПАДПІСКА ЗАВЯРШАЕЦЦА

**25 лістапада завяршаецца падпіска на газеты і часопісы на 1971 год, але ўжо цяпер можна прааналізаваць некаторыя вынікі.**

**У параўнанні з мінулым годам ва універсітэце значна палепшылася падпіска на камсамольскія выданні. Да 16 лістапада мінулагодняя лічба павялічылася на 1000 экземпляраў.**

**У першую чаргу хочацца адзначыць філалагічны факультэт, які першым закончыў падпіску. Камітэт камсамола і асабліва сакратар Ірына Рабчынская, а таксама адказны за падпіску Уладзімір Адамушка многае зрабілі для паспяховага правядзення падпісной кампаніі. Філолагі выпісалі звыш 650 камсамольскіх газет і часопісаў.**

**Нядрэнна была арганізавана падпіска на біялагічным факультэце. Вялікую дапамогу камітэту аказаў сакратар партбюро біяфака А. С. Шуканаў.**

**Хімічны, матэматычны, прыкладной матэматыкі, гістарычны факультэты таксама ўжо даўно выканалі план падпіскі. Цяпер адказныя за гэтую важную кампанію заканчваюць афармленне ў Саюздруку апошніх квітанцый.**

**Затрымалася афармленне дакументаў на фізічным факультэце. Камітэт камсамола некалькі сваіх пасяджэнняў спецыяльна прысвяціў падпісцы. Цяпер становішча палепшылася.**

**Недастаткова ўвагі ўдзяліў падпісной кампаніі камітэт камсамола геафака. На факультэце доўгі час работа па падпісцы вялася стыхійна, не кантралявалася камітэтам камсамола.**

**У застаўшыяся да заканчэння падпіскі дні яшчэ можна ліквідаваць маючыя месца недахопы і паспяхова завяршыць падпісную кампанію.**

**Ул. КУЗЬМІНАЎ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ.**



## КАНЦЭРТЫ СПАДАБАЛІСЯ

У мінулую нядзелю калектыў народнага аркестра універсітэта быў госцем у працаўнікоў Чэрвеня і Беразіно.

Залы дамоў культуры былі перапоўнены. Студэнты выступілі з вялікай і цікавай праграмай. Упершыню ў гэты дзень аркестрам і салістам Барысам Івановым была выканана «Волжская фантазія» Міхайлава.

Вельмі добра прагучалі ў выкананні аркестра «Марш-гратэск» Бялецкага, «Сіртакі» Тэадаракіса. Добра былі прыняты і салісты аркестра Яўген Сафонаў і Ларыса Чапурко.

**В. ЯРОХІНА.**

Вестка аб тым, што ў актавай зале універсітэта выступіць папулярны спявак Валерый Абадзінскі, прымусіла студэнтаў змяніць свае планы. Пасля заняткаў больш як 3000 чалавек пабывалі на двух канцэртах спевака.

Нядаўна гасцямі студэнтаў і выкладчыкаў БДУ быў літоўскі інструментальна-вакальны ансамбль «Агні Нёмана». Асабліва многа апладысментаў выпала на долю артыстаў Эзіса Гарбавіса, Стасіса Павілакціса, Оне Валічавічуці, Энрыкіса Хакаві і іншых. Канцэрт вельмі спадабаўся прысутным.

**І. СЦЯПУРА.**

## КУБАК РАЗЫГРАН

*13—14 лістапада ў спартыўнай зале педінстытута імя Горкага адбыўся розыгрыш Кубка рэспублікі па мастацкай гімнастыцы. Ва ўпартай барацьбе ён дастаўся майстру спорту з таварыства «Спартак» Наташы Бардушка.*

*Нядрэнна выступілі нашы дзяўчаты — майстры спорту Алена Цярэхіна (І курс біяфака) і Ірына Рогач (ІІ курс матфака).*

*В. ЯКАНЕН.*

Ідзе чарговае пасяджэнне геалагічнага гуртка на геаграфічным факультэце. Студэнтка 4-га курса Надзя Шафарэвіч расказвае аб сваёй практыцы, якую яна праходзіла ў брэсцкай пошукавай партыі. Тэма выступлення студэнта 5-га курса Васіля Лабадаева — «Перспектывы нафта-газаноснасці Брэсцкай упадзіны» (на здымку злева).

Заняткі вядзе дацэнт кафедры геалогіі Вера Васільеўна Шчыглова.

Фота **Д. Чаховіча.**



## НАВУКА, ЛІТАРАТУРА, ГЕРОЙ

«Навука і літаратура... У якой узаемасувязі знаходзяцца гэтыя дзве сферы чалавечай дзейнасці? Дзе іх спецыфічная мяжа? Ці ўплывае навуковы прагрэс на літаратуру, мастацтва? І ўвогуле — ці робіць уплыў вобразная думка, свет цудоўнага на развіццё навукі?» — гэтыя і шмат іншых хвалюючых палемічных пытанняў, аб якіх пойдзе гаворка ніжэй, узнімае ў сваім даследаванні «Навука, літаратура, герой» вядомы ўкраінскі крытык і літаратуразнаўца Барыс Спірыдонавіч Бурак.

Перш чым пачаць кароткі разгляд гэтай кніжкі, неабходна адзначыць: амаль усім працам Барыса Спірыдонавіча ўласцівы палемічны пафас. А сапраўдная палеміка, як вядома, — гэта заўсёды пошукі новага, арыгінальнага, гэта заўсёды **свае думкі, свае меркаванні.**

Палеміка Б. С. Бурака мае своеасаблівы характар. Ён паважліва разглядае думку сваіх апанентаў, часам нібы падзяляе іх погляды, а потым дае чытачу багаты фактычны матэрыял, на падставе якога робіць свае вывады. Такім чынам, палеміка Б. С. Бурака — гэта няўрымслівыя пошукі ісціны, без чаго не бывае навукі ўвогуле і навукі аб літаратуры ў прыватнасці.

Новая праца Б. С Бурака складаецца з шасці раздзелаў, якія на першы погляд не звязаны паміж сабою. Напрыклад, першы — «Прагрэс і эстэтычнае асваенне рэчаіснасці», другі — «Чалавек навукі ў жыцці і літаратуры». Ці ёсць (мяркуючы хаця б па назвах) тут агульнае паміж імі, якое б звязвала гэты і астатнія раздзелы ў адно цэлае? Ёсць! Яно, на наш погляд, у сутнасці самой назвы кнігі — «Навука, літаратура, герой». Тры гэтыя словы, узятыя ў цеснай сувязі паміж сабою, — праблема, якая хвалюе зараз чалавецтва.

XX стагоддзе — стагоддзе навукі і ў той жа час — стагоддзе літаратуры, мастацтва. А ці ж існуюць сувязі паміж мастацкім словам і навуковым адкрыццем? Ці існуе паміж імі **ўзаемаўплыў!** «Хіба ж не пацвярджае блізкасць і ўзаемаўплыў літаратуры і навукі і той вядомы факт, што ў гісторыі мы маем шмат прыкладаў, калі дзеячы навукі займаліся і мастацкай творчасцю, — піша Б. С. Бурак. Сапраўды, нам вядома навуковая і літаратурная дзейнасць Ламаносава, Філатава. А акадэмік В. Абручоў? Ён жа вядомы нам не толькі як заснавальнік неатэктонікі, стваральнік шматлікіх навуковых прац, але і як аўтар навукова-фантастычных раманаў. «Бацька кібернетыкі» Вінер у той жа час і аўтар раманаў «Спакуснік», «Тое, што пад каменем». Прыклады, прыклады... Іх можна ўспамінаць і ўспамінаць, і ў большасці сваёй яны будуць падмацоўваць думку: паміж навукай і літаратурай існуюць сувязі. А як жа з тэзісам: літаратура і навуковае адкрыццё? Б. С. Бурак зусім справядліва піша: «Калі Эйнштэйн гаворыць пра ўплыў на яго творчасці Дастаеўскага (гл. кнігу Б. Кузняцова «Этюды аб Эйнштейне», М., 1963 г. — С. Л., П. Т.), то мы ж разумеем, што пісьменнік не даваў яму нейкіх навуковых даных, не вылучаў перад ім пэўных гіпотэз. Сваім мастацкім бачаннем жыцця, веданнем духоўнага свету чалавека ён будзіў у вучонага тыя імпульсы, без якіх няма пошукаў і адкрыццяў».

Такім чынам мастацкая літаратура не падказвае навуцы, а спрыяе нараджэнню ідэй.

Адну са сфер узаемаўплыву навукі і мастацтва Б. С. Бурак бачыць у навукова-фантастычнай літаратуры. Аўтар падрабязна разглядае (часам спрачаецца!) гэтае пытанне, звяртаючыся на прыкладах да здабыткаў сусветнай літаратуры ў гэтым жанры, паступова падводзячы чытача да наступнага: «Роля вучонага і навукі як у жыцці, так і ў літаратуры бязмежна ўзрастае; па глыбляюцца ўзаемаўплывы і ўзаемасувязі паміж літаратурай і навукай, пашыраюцца іх спецыфічныя кардоны... Літаратура ўвесь час узбагачаецца пазнавальна-навуковай інфармацыяй».

У наступных раздзелах (мы спыніліся на праблематыцы першага) Б. С. Бурак спыняецца на пытаннях: чалавек навукі ў жыцці і літаратуры; кібернетыка, мастак, грамадства, украінскі раман і сучаснасць; навуковы прагрэс і праблемы трагічнага і камічнага; гістарызм характару і г. д. Гэтыя і шматлікія пытанні, якія ўзнімае ў сваёй кнізе Б. С. Бурак, зацікавяць не толькі філолагаў, філосафаў, журналістаў, але і спецыялістаў (цяперашніх і будучых) у галіне фізікі, матэматыкі, біялогіі, хіміі і г. д. Толькі вельмі шкада, што такая цікавая і багатая думкамі і зместам (а таксама напісаная цудоўнай мовай) кніга Б. С. Бурака «Навука, літаратура, герой» выдадзена параўнаўча невялікім тыражом — 2000 экземпляраў. Нам здаецца, што яе неабходна перавыдаць і перавыдаць на рускай мове, каб яна стала здабыткам не толькі ўкраінскага чытача, але і ўсесаюзнага. Кніга заслугоўвае гэтага.

**С. ЛЫСЕНКА,**
**П. ТКАЧОЎ.**

## ШТО ТАКОЕ СТУДЭНТ?..

*Над горадам апускаецца таямнічы вячэрні змрок. То тут, то там запальваюцца ў вокнах дамоў вясёлыя агеньчыкі. Прыветліва свецяцца і вокны студэнцкай сталовай, што па вуліцы Кастрычніцкай. Групамі і паасобку спяшаюцца сюды на «Блакітны агеньчык» камсамольскія актывісты гістфака. Рабяты запрасілі да сябе на вечар і замежных студэнтаў—Жані Маганьёз і Флоранс Баканье (Францыя), Жака Антуана Амідзі (Ліван).*

*— Наш сённяшні агеньчык прысвячаецца Міжнароднаму дню студэнтаў, — гаворыць, адкрываючы вячэрнюю ўрачыстасць, сімпатычная бялявая дзяўчына Нэлі Сямелькіна. — Што такое студэнт?.. Вось, на твой погляд, Валодзя, што такое студэнт?*

*Валодзя Арлоў займаецца на аддзяленні філасофіі і, натуральна, разважанні пачынае са свайго пункту гледжання. Шырокую прамову ён заканчвае кароткім выслоўем: «Студэнт — гэта дапаўненне да шпаргалкі».*

*Як бачна, рабяты, адказваючы на пытанне Нэлі, падыходзяць да яго з гумарыстычнага боку. І сапраўды, у студэнцкім жыцці жарты, смех займаюць адно з галоўных месц, бо студэнт — гэта чалавек самы жыццярадасны, які ніколі не падае духам. Вельмі трапна аб студэнтах сказала Галя Дулінец: «Гэта людзі, якія могуць на працягу ночы вывучыць увесь курс навукі, а пасля экзамена ўсё забыць».*

*Сваю думку аб студэнце запрашаюць выказаць і гасцей, а потым гаспадары паказваюць, што такое агеньчык, калі разам суседнічаюць песня і танец, жарты і смех, калі, толькі пачуўшы першыя акорды «Сіртакі» або задорную мелодыю «Калінкі», рабяты так вытанцоўваюць, што аж запыхваюцца, але застаюцца задаволенымі.*

*— Студэнт — гэта прагрэс, рухавік навукі, — палемічна сцвярджае Валодзя Арлоў, працягваючы распачатую размову. — У гэтым вы можаце пераканацца самі. Вось паглядзіце, як робяць прагрэс студэнты.*

*Валодзя са сваім сябрам, таксама Валодзем, Міхальцовым, выходзіць у цэнтр залы. Паказаныя імі сцэнкі са студэнцкага жыцця выклікаюць шчодрыя апладысменты...*

*Аб'яўляецца конкурс на лепшы студэнцкі анекдот-жарт. Пераможцам тут становіцца Жэня Бурак.*

*Вось і настала пара развітвацца. Апошні танец. Як не хочацца ісці дадому! Але ўсё часцей гаснуць у вокнах агні, цішэй становіцца вуліца. На цёмным акаміце ночы успыхваюць гарэзлівыя зоры, задорна падміргваюць вастраносаму Месяцу, нібы пытаючы ў яго: «А ты ведаеш, што такое студэнт?..»*

*Т. СЕНЧЫК,*
*наш кар.*

## ПАЧЭСНАЕ ЗВАННЕ—ДОНАР!

Ва універсітэце стала добрай традыцыяй праводзіць дзень донара. Кожны раз у гэты дзень многія студэнты становяцца донарамі, здаюць кроў бязвыплатна. Слова «донар» у перакладзе з лацінскай мовы азначае «дорачы». Чалавек дорыць сваю кроў і гэтым выратоўвае жыццё многіх.

Бязвыплатнае донарства зарадзілася ў гады Вялікай Айчыннай вайны, калі так патрэбна была донарская кроў раненым абаронцам Радзімы.

Пасля вайны бязвыплатнае донарства атрымала шырокае распаўсюджанне. І цяпер у нашай краіне налічваецца больш паўмільёна донараў. Донарская кроў патрэбна кожны дзень, кожную гадзіну. Цяжка назваць галіну медыцыны, дзе б не прымянялася пераліванне крыві як моцны лячэбны сродак. Яно з'яўляецца эфектыўным пры складаных аперацыях, пры зацяжных захворваннях. З крыві рыхтуюць многа лячэбных прэпаратаў. І дзякуючы донарам хворыя атрымліваюць кроў, кампаненты крыві і лячэбныя прэпараты з яе бясплатна і своечасова.

Нашай вялікай краіне неабходны мільёны донараў. І студэнты універсітэта добра разумеюць гэта. У 1969 годзе, напрыклад, 420 чалавек бязвыплатна здалі кроў, некаторыя з іх неаднаразова. Так, студэнт фізічнага факультэта Ю. Макараў здаў кроў 6 раз, студэнтка юрыдычнага факультэта Л. Куцеева — 5 раз, студэнты матэматычнага факультэта Н. Чарнавокая і Н. Зелянкоў — 5 раз, студэнт гістарычнага факультэта А. Мінееў — 4 разы. Такіх донараў ва універсітэце многа. Усе яны адчуваюць сябе добра, таму што донарства бясшкодна для здароўя. Арганізм хутка аднаўляе тую невялікую затрату, якую нясе донар.

**Ф. РЭЗНІКАВА,**
**урач медпункта БДУ.**

РЭДАКТАР
А. А. НІКОЛЕНКА.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19. Тыраж 2000 экз. Зак. 1494. АТ 22468